# Эсэ “Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі маёй сям’і”

Курыленка Дзіяна Аляксандраўна,
ДУА “Ельская раённая гімназія”

Эсэ “Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі маёй сям’і”

Якое шчасце – жыць у мірны час, у мірнай краіне!

Мы сапраўды вельмі шчаслівыя людзі, таму што жывём у мірнай краіне. Больш за сем дзесяцігоддзяў аддзяляюць нас ад тых суровых і хвалюючых дзён, калі беларуская зямля была вызвалена ад нямецка-фашысцкага нашэсця. Больш за сем дзесяцігоддзяў не праходзіць пякучы боль у сэрцах нашых ветэранаў. Не, гэта не проста словы. Раней я б так і падумала. А цяпер, калі я стала дарослай, упэўнена, што гэта сапраўды не проста словы.

Вялікая Айчынная вайна прыйшла ў кожную хату, у кожную сям'ю. Вайна была агульным болем і бядой. Усе мужчыны сталі на абарону Радзімы. У тыле засталіся дзеці, жанчыны і старыя. Усе яны набліжалі Перамогу сваімі подзвігамі.

Не абышла бокам Вялікая Айчынная вайна і нашу сям'ю.

Мне вельмі хочацца расказаць пра свайго слаўнага дзядулю Міхаіла. Ён з першага і да апошняга дня быў на фронце. Хапіла ўсяго на яго долю: быў паранены не адзін раз, даводзілася адступаць і наступаць, быць халодным і галодным. Але застаўся жыць.

Скончылася вайна, вярнуўся дадому, а тут яшчэ адно гора: бацькі яго і дачка загінулі. Думаў ён, што гэтая апошняя рана звядзе яго ў магілу. Але не... Раны паступова загаіліся, але сэрца памятае і жахі вайны, і тых, хто загінуў…

Не любіць дзядуля ўслых успамінаць пра вайну, не любіць расказваць. Колькі б яго ні прасіў, а ён адно: “Не магу. Адразу перад вачамі паўстаюць маладыя хлопцы, якія сядзелі ў акопе, жартавалі, смяяліся, а потым, як адзін, засталіся там назаўсёды”. І адразу твар яго становіцца суровым, замкнёным, і цэлы дзень да яго нельга падступіцца.

Мы і не надакучаем яму: бабуля прывучыла нас не трывожыць дзеда. Яна казала: “Не чапайце, не напамінайце пра вайну, ён каторы раз праходзіць сцежкамі памяці”.

Нас, праўнукаў, гэта заўсёды здзіўляла: як гэта праходзіць сцежкамі памяці?

І зразумела я гэта не вельмі даўно.

Дзядуля святкаваў свой дзень нараджэння два разы на год. Мы не маглі зразумець, чаму гэта ў нас адзін дзень нараджэння, а ў яго два. Мы зайздросцілі яму. Толькі калі я падрасла, то зразумела, што другі дзень нараджэння ў яго незвычайны: ён не радаваўся, не весяліўся, адзначаў заўсёды адзін. Вып’е чарку гарэлкі, другую паставіць на стол і пакладзе кавалачак хлеба. Доўга стаіць чарка, і ніхто да яе не дакранаецца. А дзед сядзіць такі пануры і задуменны, не зварухнецца, не скажа ні слова, а ўсё думае і думае аб нечым сваім… А бабуля гаворыць: “Пайшоў зноў па сваіх сцежках памяці, не займайце яго”.

І вось аднойчы я не вытрымала, падышла да дзядулі, кранула яго за плячо і сказала: “Дзядулька, а раскажы мне, пра што ты думаеш. Можа, лягчэй табе будзе. Я зразумею цябе”.

Ён доўга глядзеў на мяне і вагаўся: расказаць ці не? Потым сказаў: “Сядай”.

І пачула я ад свайго дзядулі такую гісторыю: "Быў жорсткі, бязлітасны бой. Было ўжо праліта шмат крыві. Безупынку наступалі немцы, і нашым часцям давялося адступаць. Адступаючы, я не заўважыў, як уваліўся ў глыбокую варонку, пакінутую снарадам. У варонцы ляжаў паранены палкоўнік. Ён з надзеяй зірнуў на мяне і слабым голасам сказаў: "Дапамажы мне, салдат… Вынясі мяне… Атрымаеш "Зорку"".

Я тады неяк і не падумаў пра ўзнагароду, мне проста шкада яго стала як чалавека. Ледзь выбраўся з гэтай яміны, узваліў на сябе палкоўніка і пацягнуў да акопа. Не паспеў прапаўзці і пяці метраў, як пачуўся выбух. Нас прываліла зямлёй, нельга паварушыцца, нельга паўзці далей. І толькі адчуваю, што кроў струменем бяжыць у мяне па твары. Адна толькі думка: хто паранены? Ён ці я? Неяк удалося мне вызваліцца з зямлі і дапаўзці да акопа. Толькі там я ўбачыў, што палкоўнік мёртвы. Уся спіна яго была пасечана асколкамі. Пахавалі яго там, а я запомніў, адкуль ён, дзень яго нараджэння і як яго завуць. Аказваецца, што не я яго выратаваў, а ён мяне.

Пасля вайны я ездзіў да яго на Радзіму, шукаў сваякоў. Але нікога не знайшоў: усіх расстралялі немцы. І ведаеш, унучка, мне ўжо дзевяноста гадоў, а я да самай сваёй смерці буду памятаць, каму абавязаны жыццём. Сёння я святкую дзень нараджэння яго, палкоўніка. Ён жа быў зусім малады, і застаўся маладым у маіх успамінах. Я не атрымаў "Зорку", я атрымаў большае – жыццё.

Шмат гора прынесла вайна. Маці не дачакаліся сваіх сыноў, дзеці страцілі бацькоў. Але аб тых, хто загінуў, хто аддаў жыццё за нашу родную зямлю, забываць нельга. Ведай, унучка, мінулае – гэта шлях у будучыню, і трэба, каб заўсёды была ў нашых сэрцах памяць аб кожным чацвёртым.

Вось і цяпер, я табе расказваю і адчуваю, як бяжыць у мяне па твары струменьчык крыві, яго крыві, палкоўніка. І таму я святкую яго дзень нараджэння, яму б яшчэ жыць ды жыць".

Дзядуля змоўк, а я сядзела і не магла паварушыцца. Я баялася яму перашкодзіць успамінаць, пабыць разам з тымі людзьмі, з якімі ён ваяваў. Я зразумела адно: той боль, тыя раны не загояцца ніколі, да самай смерці будуць пячы і балець, а слёз, каб выплакаць іх, няма.

Заўсёды ўспамінаю радкі з верша Яўгеніі Янішчыц "Дзед":

Ён прайшоў агонь і вецер,
І зямлю прайшоў наскрозь.
І жыве мой дзед на свеце,
Дзед, які не любіць слёз.
І куфаечка салдацкая
На худых яго плячах…

Не забывае мой дзядуля палкоўніка, а цяпер не забуду яго і я. Назаўсёды застануцца ў памяці маёй словы дзеда: "Мінулае – гэта шлях у будучыню".

Я зразумела, што добрыя ўчынкі робяць чалавека чалавекам, нават боскай істотай, якая гатова дзеля людзей аддаць і сваё жыццё. Гэта тыя ўчынкі, якія дапамагаюць нам быць шчаслівымі, жыць у мірнай краіне.